Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №1(34), 2006

*УДК 882.6.09*

# Спецыфіка паэтыкі сучаснай гістарычнай прозы

В. К. Шынкарэнка

Характарызуючы асноўныя жанраваўтваральныя тэндэнцыі прозы пра мінулае, трэба найперш адзначыць іх дынаміку ў літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў. Разам з захаваннем традыцыйных структур адзначаецца схільнасць гістарычнага эпасу да сінтэзу, пашырэння часавых абсягаў, узбагачэння вобразна-структурнымі і моўна-стылявымі сістэмамі іншых рода-відавых мастацкіх адзінак пры ідэйна-праблемнай і эстэтычнай матываванасці. Гэта яшчэ раз падмацоўвае слушнасць наступнай думкі Ю.Тынянава: "…вывучэнне ізаляваных жанраў па-за знакамі той жанравай сістэмы, з якой яны суадносяцца, немагчыма" [1, с. 276].

Прыкметнай якасцю сучаснай прозы пра мінулае становіцца ўвага не толькі да яркіх, занатаваных гістарыяграфіяй, але і малавядомых старонак ранейшых часоў, магчымых версій тых ці іншых падзей, разбурэнне стэрэатыпаў у іх адлюстраванні, імкненне да дэталізацыі, мікрааналізу побач з шырокім ахопам матэрыялу. Час і лёс асобы, а перадусім барацьба з бяспамяцтвам, змаганне з небыццём, духоўнай смерцю складаюць цэнтральныя матывы творчасці У.Арлова (1953), які спрабуе дакапацца праз сэнс слоў да "сэнсу саміх рэчаў" (Р.Барт). Варта падкрэсліць, што кожны самастойны тып мастацкай структуры, у тым ліку і гістарычнае апавяданне, адрозніваецца пэўнай праблемна-зместавай скіраванасцю і спецыфічнай фармальна-паэтычнай арганізацыяй. Незалежна ад аб'ёму мастацкі твор кожным элементам даносіць непаўторны паэтычны свет аўтара, нараджае характэрную эмацыянальную танальнасць, якая пранізвае не толькі ідэйна-вобразны змест, але і кампазіцыю, гукавы лад, сінтаксіс структурнага цэлага. Аповед пра мінулае разам з дакументальнасцю і гістарызмам, адноснай аб'ектыўнасцю ў падачы матэрыялу яшчэ раз даказвае, што кожны жанр характарызуецца ўласнымі нормамі, законамі існавання, код якіх нясе ў сабе іх паэтыка. Істотную адзнаку апошняй у малой прозе У.Арлова складае праблема апавядальніка. Многія творы аўтара па сваёй форме ўяўляюць персаніфікаваную споведзь, хроніку, грамату, маналог, запавет або адметны, блізкі да драматычнага па паліфанічнасці ідэй і калізій, празаічны жанр. Некаторыя навелы вылучаюцца сказавай формай, прыёмамі вуснага маўлення, што ствараюць асаблівую атмасферу даверу, пераконваюць у дакладнасці фактаў, а ў структуры ўвасабляюцца праз кампазіцыйную раскаванасць, нечаканыя мастацкія формы, арыгінальныя стылізацыі.

У разнастайнасці паэтычных прыёмаў і сродкаў рэалізацыі мастацкай задумы пераконваюць гістарычныя аповесці празаіка. Якраз у гэтай эпічнай форме У.Арлоў здолеў арганічна паяднаць нязменную ўвагу да даўніны, роздумны разгляд асобы ў варунках часу з іх майстэрскім архітэктанічным і вобразна-стылістычным увасабленнем. У аповесці "Дзень, калі ўпала страла" (1987) няпростую задачу, якую бярэцца вырашыць князь Уладзімір, падкрэслівае ўвесь аналітычны стыль твора, біблейскія і народныя афарыстычныя выслоўі, рамантычная сімволіка, псіхалагічныя паралелізмы, перыфразы, параўнанні і іншыя сродкі мастацкай вобразнасці. У некаторых месцах гучанне аповесці па эмацыянальным напружанні, інтанацыйна-сінтаксічным складзе набліжаецца да былінна-сказавага. Пры гэтым плынь унутранага дзеяння, перадача трывожных думак, што ткуцца-пераносяцца ў свядомасці князя, знешне выяўляюцца праз сціслыя фразы-заўвагі, якія занатоўваюць зрухі часу, канстатуюць надыход новых падзей. Актыўна выкарыстоўваюцца У.Арловым антанімія, ампліфікацыя, экспрэсіўна-афарбаваныя параўнанні, эпітэты, якія дазваляюць гаварыць пра ярка выражаную рамантычную адметнасць гэтага гістарычнага твора.

Патрыятычная скіраванасць аповесцей "Час чумы" (1986) і "Сны імператара" (1990) пранізвае ўсе вобразна-тэматычныя і эмацыянальна-стылявыя ўзроўні. І гэта пры тым, што ў Гусоўскага і Напалеона розныя задачы і шляхі сцверджання свайго "я". Калі ў першага яно

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

адбываецца праз напісанне мастацкага твора, што ўзнясе аўтара “Песні пра зубра” на недасяжную вышыню, то ў нядаўняга светаўладальніка – праз пераасэнсаванне далёка не гераічных учынкаў, канкрэтных спраў, зварот да часоў трыумфу і паразы. З мэтай сутнаснага спасціжэння характараў герояў празаік часта звяртаецца да псіхалагічных паралелізмаў, іх мрояўуспамінаў у двухпланавай сюжэтна-кампазіцыйнай структуры, розных форм паўтораў, афарыстычна афармленых думак-падагульненняў, вершаваных цытат, якія ствараюць уражанне жывога дыхання твора, яго ўдыхаў-выдыхаў, рытмічнай змены нарастання эмоцый самапаглыбленымі развагамі, зрухамі ў дзеяннях і настроях. Пералічаныя якасці разам з гістарычнай канкрэтыкай, уменнем спалучыць храналагічны і рэтраспектыўны планы адлюстравання сведчаць пра актыўныя мастацкія пошукі аўтара, які, адштурхоўваючыся ад вобразна-паэтычнага ладу пісьма У.Караткевіча, яго насычанай фарбамі і гукамі рамантычнай манеры, здолеў адшукаць уласныя шляхі да самавыяўлення і, магчыма, блізкі да заваёвы буйной і арыгінальнай эпічнай формы.

Як вынікае з зазначанага вышэй, гістарычныя апавяданні, аповесці і эсэ У.Арлова вылучаюцца непаўторным паэтычным светам, адметным кампазіцыйным рашэннем, разгорнутай рамантычнай танальнасцю, дзе трагічнае не выключае прысутнасці іншых прынцыпаў выяўлення ідэйна-эстэтычнага пафасу і перадаецца праз адпаведную сістэму вобразна-выяўленчых сродкаў. Несумненная пераканаўчасць ідэалаў пісьменніка, адстойванне ім прыярытэту нацыянальнага як умовы роўнакаштоўнага і паўнавартаснага існавання ў Сусвеце.

Адметная канцэпцыя светаўпарадкавання і мінуўшчыны ў рамане “Храм без Бога” (1992) В.Чаропкі (1961) увасабляецца ў апавядальнай шматузроўневай структуры аналітычна-рэалістычнага тыпу, спецыфічнай па форме падачы матэрыялу і вектарах яго засваення. Выяўленая на пачатку твора адначасовасць у паказе падзей хутка саступае месца восі паслядоўнасці, прычынна-выніковай узаемаабумоўленасці дзеяння, чым і тлумачыцца дынамічнасць сюжэта, яго рухомасць, што ў тэксце перадаецца праз напружанасць рытму, дакладнасць фразы, інверсійнасць, паўторы-анафары, частае выкарыстанне дзеясловаў руху. З дапамогай адпаведных паэтычных прыёмаў і сродкаў, сюжэтных матываў, кампанентаў арганізацыі аўтарам рэканструіруюцца падзеі пачатку XVI ст., узнаўляюцца трагічныя стасункі людзей са сваім часам, яго ідэаламі. Аб’ектыўна-апавядальная плынь твора, гістарычныя рэаліі, перыпетыі складаных чалавечых лёсаў на працягу ўсяго дзеяння рыхтуюць, высноўваюць план абагульняючай філасофскай думкі аб сэнсе жыцця, яго высокім прызначэнні і, з другога боку, яго хісткасці, залежнасці ад няўмольных абставін, экзістэнцыйнай невырашальнасці некаторых праблем. Іншы раз героі празаіка пад націскам выпрабавальных акалічнасцей, па асабістых прычынах адступаюць ад маральных прынцыпаў, ранейшых перакананняў, нішчаць выбудаваны ў душы светлы Храм Бога, што асабліва разбуральна ўздзейнічае на асобасны пачатак.

Канкрэтна-гістарычная аснова аповесці “Навь-явь-правь” (1987) звязана з далёкімі падзеямі пачатку XI ст., паходамі Яраслава Мудрага на літоўскія землі і яго задумай пабудаваць Наваградак на месцы літоўска-дрыгавіцкага паселішча Жаўны. Але дакладнасць не змяншае мастакоўскай увагі да прыватнага трагічнага канфлікту паміж братамі Волакам і Вышакам, што ўзмацняецца абагульненымі матывамі экзістэнцыйна-філасофскага (навь-явь) і сацыяльна-псіхалагічнага (правь) гучання. Адметнасць тэматычнага поля і паэтыкі аповесці ўтварае прысутнасць у ёй вялікай колькасці структурных элементаў, звязаных з перадачай старажытных вераванняў, каляндарнай паэзіі, замоў, абрадаў і звычаяў продкаў, іх персаніфікаваным ўспрыманнем прыроднага свету. Гэта надзвычай разнастаіць стылявую танальнасць, узмацняе пачуццёвае гучанне твора. Казачна-фантастычнай метафарычнасцю адрозніваецца своеасаблівы сучасны апокрыф В.Чаропкі “Перамога ценю” (1989), у аснове якога новае прачытанне лёсу вядомага ва ўсім хрысціянскім свеце святога Георгія Пераможцы. Апавяданне “Адрачэнне ад цемры” (1990) утрымлівае арыгінальнае трактаванне слепаты таленавітага аўтара “Іліяды” і “Адысеі” праз зварот да найскладанейшай праблемы ўзаемаадносін мастака і мастацтва, поўнай адданасці творцы справе, што не прымае палавінчатасці. Стварэнне эпасу сляпым аэдам і ёсць адмаўленнем ад змроку, адкрыццём брамы ў неўміручасць, дасягнутай дарам любові і таленту самога чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Такім чынам, В.Чаропка не ўяўляе сваёй творчасці без звароту да тэмы сівой даўніны, герояў ранейшых эпох і, што актыўна і плённа выступае ў самых розных публіцыстычных і ўласна літаратурных формах гістарычнай прозы. Пры гэтым аўтарская канцэпцыя асобы і мінулага ўвасабляецца як у аб'ектыўна-дакладных апавядальных структурах, так і ў творах абагульненай філасофска-псіхалагічнай ці ўмоўна-міфалагічнай скіраванасці.

Не выклікае сумнення той факт, што менавіта эпас з яго высокім узроўнем развіцця, а найперш – проза пра мінулае, сведчыць пра сапраўдную сталасць нацыянальнай літаратуры, яе сур'ёзныя мастацкія здабыткі. Адпаведна з прадметна-тэматычным прынцыпам родава-відавой класіфікацыі ў прыгожым пісьменстве разам з уласна гістарычным, гісторыка-рэвалюцыйным, палітычным, ваенным і іншымі тыпамі раманаў можна вылучыць і біяграфічны з яго адметнымі прыёмамі ўзнаўлення рэчаіснасці, абставін і асобы ў іх. Такая структурная адзінка балансуе на мяжы навуковага даследавання і літаратурнага твора, а абсягі падзей у ёй звычайна суадносяцца з працягласцю ці пэўным перыядам жыцця галоўнага героя. Прысутнасць элементаў мастацкай фантазіі не змяншае ў творы значэння гістарызму, дакладнасці ці верагоднасці. Якраз на суадносінах пералічаных адзнак у біяграфічнай прозе ўзнікаюць такія яе разнавіднасці, як навуковая, навукова-папулярная, белетрызаваная біяграфія, мантаж дакументаў, літаратурны партрэт, аўтабіяграфія, біяграфічны раман, што розняцца некаторымі жанраваўтваральнымі прыкметамі. Філасофска-эстэтычнай праблематыкай вылучаюцца раманы-эсэ А.Лойкі (1931) "Як агонь, як вада..." (1984) і "Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае" (1990), біяграфічныя творы "Крыж міласэрнасці" (1982 – 1996), "Пакліканыя" (2002 – 2003) В.Коўтун (1946). Жанравай адметнасцю звяртае на сябе ўвагу "Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі" (2004) Я.Конева. Дадзеныя мастацкія адзінкі пераканаўча сведчаць пра прыкметнае ўзмацненне лірычна-суб'ектыўнага аўтарскага пачатку ў гістарычным эпасе, пацвярджаюць нязменную ўвагу сучаснай літаратуры да выключных асоб нацыі, духоўнай спадчыны наогул.

Праблемы сэнсу чалавечага жыцця, аксіялагічных каштоўнасцей і эстэтычных ідэалаў папярэднікаў, застаючыся актуальнымі ва ўсе часы, плённа вырашаюцца як у біяграфічнай прозе, так і іншых мастацкіх формах гістарычнай тэматыкі. Жанр свайго рамана "Кліч роднага звона" (1995 – 1999) Г.Далідовіч (1946) вызначыў як хроніку. Але захапіўшыся асабістай лініяй жыцця галоўных герояў (ваяводы Усяслава, князя Міндоўга і іншых), празаік толькі ў канцы раманнага тэксту і эпілозе пачынае ўзмоцнена сцвярджаць заяўленае і літаральна пераўтварае мастацкую тканіну зместу ў паведамляльна-летапісную, фактаграфічную. Пры ўсіх станоўчых адзнаках і захаванні прынцыпу гістарызму раман "Вялікая княгіня" (1996) І.Шамякіна (1921) не пазбаўлены асобных сацыяльных і моўных анахранізмаў. Авантурна-прыгодніцкім характарам дзеяння, абагульнена-сімвалічным і адначасова канкрэтна-рэалістычным семантычным полем, дакладнай і містычнай умоўна-знакавай прасторай мастацкага тэксту адрозніваецца раман А.Наварыча (1960) "Літоўскі воўк" (2003), прысвечаны паўстанню 1863-64 гг., праблеме вернасці і здрады пэўнай часткі грамадства яго ідэалам. Заўважная іранічнасць пісьма, наўмысна падкрэсленая засяроджанасць на інтымна-прыгодніцкай сюжэтнай лініі, адчувальнае пасмейванне над квасным патрыятызмам, сентыментальнасцю, залішняй пафаснасцю выказванняў асобных герояў не перашкаджае пісьменніку сцвердзіць уладу вызваленчай ідэі паўстання над духам і душамі акрыленых ёю сапраўдных змагароў. Рыцарская аповесць А.Бутэвіча (1948) з інтрыгуючай назвай "Каралева не здраджвала каралю..." (2003) у сваёй асноўнай гісторыка-рамантычнай сюжэтна-кампазіцыйнай канве змяшчае вялікую колькасць украпванняў з самых розных вуснапаэтычных жанраў, дэталёва перадае ўяўленні продкаў пра светабудову з яе загадкавымі дзевяццю нябёсамі, сярод якіх самае дзіўнае – сёмае, дзе ўладарыць Рай і знаходзяцца прабацькі ўсяго жывога.

Істотнай адзнакай паэтыкі сучаснай гістарычнай прозы з'яўляецца сумяшчэнне розных часавых пластоў у межах адной жанравай формы. Пры гэтым асвятленне падзей можа падавацца з захаваннем іх храналагічнай паслядоўнасці, паралельна ці ў плане супастаўлення мінулага і сучаснага, са шматлікімі адступленнямі ад асноўнай падзейнай лініі або строгай вытрыманасцю яе. Адмысловасцю ўвасаблення творчай задумы, арыгінальнасцю спалучэння гістарычнага і сучаснага матэрыялаў адрозніваюцца раманы "Стан бязважкасці" (1973) поль-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

скага аўтара А.Кусьневіча і "Святыя грэшнікі" (1988) беларуса А.Асіпенкі. Канкрэтная сітуацыя знаходжання чалавека на мяжы паміж жыццём і смерцю дазваляе празаікам зрабіць сваіх герояў не толькі сведкамі далёкіх, амаль двухсотгадовых у першым творы і васьмівяковых у другім, гістарычных падзей, але і даказаць, што кожная з іх, нягледзячы на ступень важнасці для наступнікаў, уплывае на далейшы ход развіцця, фарміруе яго, нечакана праяўляючыся і роднячы, здавалася б, адрознае.

І зместам, і фармальнымі адзнакамі сярод сучасных твораў на тэму мінулага вылучаецца гістарычна-прыгодніцкая "Карона Вялікага Княства. Дысертацыя ў поўным сэнсе гэтага слова на тэму: хто ж такія беларусы, адкуль яны ўзяліся і што яны робяць у сусветнай гісторыі" (1999) празаіка і драматурга У.Бутрамеева (1953). Спыняючыся на падзеях XVII ст., усЛаўляючы яго асветніцкі характар, навуковыя і тэхнічныя адкрыцці, як і тое, што менавіта ў гэтую эпоху месціць сваіх адважных мушкецёраў А.Дзюма, пісьменнік падкрэслівае яе выключна важнае значэнне для айчыннай гісторыі. Прыём "міфалагічнага брыкалажу", адвольнае абыходжанне з прасторава-часавымі межамі дзеяння і героямі, раблезіянскае перабольшванне ці схаванасць за дробязнае дазваляюць аўтару звярнуцца да праблем і вобразаў-архетыпаў, асабліва блізкіх кожнаму беларусу.

Сінтэзам уласна гістарычнага і міфалагічнага вылучаецца неарамантычная творчасць Л.Рублеўскай (1965). Адметныя па жанравай спецыфіцы яе "Старасвецкія міфы горада Б*", "Шляхецкія апавяданні", "Дыярыуш пані", аповесці "Сэрца мармуровага анёла" і "Пярсцёнак апошняга імператара". На своеасаблівым мастацкім увасабленні думкі аб вечнасці зямлі і зменлівым чаргаванні людскіх пакаленняў на ёй заснаваны хранатоп паралельнага рамана пісьменніцы "Золата забытых магілаў" (2004). Яго героі – нашы сучаснікі, нашчадкі былых ворагаў, спадчыннікі прадстаўнікоў адрозных сацыяльных колаў – рашаюцца на тое, каб перарваць замкнуты ланцуг недаверу і помсты, каб у кропцы перасячэння іх, дагэтуль паралельных, лёсаў пачаўся адлік новага летазлічэння. Зразумела, што пачатак у дадзеным выпадку не азначае забыцця ўсяго папярэдняга. Да гэткай жа высновы, як і да думкі аб адказнасці і пакаранні за здраду народу, прыходзяць дзеючыя асобы твораў Ф.Сіўко, Я.Конева і іншых.

Відавочна, што ў адрозненне ад савецкай гістарычнай прозы, дзе доўгі час віталася адлюстраванне руху народных мас і выключнай ролі асобы правадырскага кшталту, сучасная літаратура, не цураючыся традыцыйных спосабаў і прыёмаў асэнсавання мінуўшчыны, сінтэзу яго з наватарскімі падыходамі да асвятлення і тлумачэння з'яў даўніны, пошукаў адметных варыянтаў прачытання агульнавядомага ў ёй, перавагу аддае не столькі падзейнаму, колькі характарнаму, незалежна ад канкрэтнасці ці выдуманасці персанажаў, прынцыпам даследавання. Пры гэтым уласна гістарычная канва твора можа істотна пашырацца за кошт дадзеных з міфалагічных і прытчавых, фальклорных і этнаграфічных крыніц, арыгінальнага аўтарскага прачытання і перагляду ранейшых версій адносна тых або іншых з'яў ці асоб.

Ідэйна-праблемны і паэтычны аналіз адрозных па структурных і мастацкіх асаблівасцях твораў А.Лойкі і В.Коўтун, Г.Далідовіча і І.Шамякіна, А.Асіпенкі і У.Бутрамеева, А.Пашкевіча і Л.Рублеўскай, А.Наварыча, А.Бутэвіча і інш. дазваляе меркаваць пра багатыя, хоць яшчэ цалкам і не скарыстаныя, магчымасці гістарычнага эпасу ў айчыннай літаратуры. У значнай ступені гэтаму спрыяюць працэсы дынамікі, заўважнага жанравага ўзаемадзеяння, "дыфузіі якасцей" (Ю.Бораў), а таксама актыўнае выкарыстанне сучаснымі творцамі як традыцыйных рэалістычных жанравых форм біяграфіі, дакумента, хронікі, так і рамантычна-прыгодніцкіх, рыцарскіх, фальклорна-міфалагічных, навацыйных структур дысертацыі, рэканструкцыі, містыфікацыі, паралельнага рамана і іншых паэтычных адзінак.

Усё вышэйсказанае дазваляе забіць наступную выснову. Гістарычны жанр як складаная зместава-эстэтычная і структурная адзінка, што праз сінкрэтызм навуковасці і мастацкасці, пэўныя тыпы мастацкіх канфліктаў, характараў, хранатопу максімальна адэкватна ўзнаўляе вобразы далёкіх эпох, "ідэі часу і формы часу", дэманструе багатыя магчымасці паэтычнай сістэмы, яе адкрытасць і гатоўнасць да зрухаў пры адносна ўстойлівым захаванні фармальнага ядра і іншых вызначальных носьбітаў жанру. Маюцца на ўвазе рэальна-фактычная аснова, што не выключае прысутнасці ў творы выдумкі і домыслу, дыстанцыя ў часе, прынцып гістарызму, якім абумоўлена прычынна-выніковая абгрунтаванасць дыялектыкі падзей і характа-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

раў, адметнасць прасторава-часавага кантынуума, яго шматвектарнасць, нацыянальна афарбаваны змestава-праблемны, вобразны, этнаграфічны і моўны каларыт.

**Abstract.** The article deals with the synthesis of realistic, romantic and mystic components in the structure of literary works about the past. It highlights traditional poetics of narrative forms being modified with postmodern techniques. The author points out the fruitfulness of combining factual and folklore-mythological elements in the plot-composition structure of historical prose.

**Літаратура**

1. Ю. Н. Тынянов, *Поэтика. История литературы. Кино*, Москва, Наука, 1977.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 15.05.05

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф.Скорины